Удзельнікі VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі наведалі ваенна-гістарычны комплекс «Партызанскі лагер», які знаходзіцца ў Дзяржынскім раёне. Тэматыка гэтай лясной экспазіцыі асабліва зацікавіла тых, хто працаваў у секцыі «Стварэнне ўмоў для павышэння сацыяльнай і эканамічнай актыўнасці моладзі ў мэтах устойлівага развіцця рэгіёнаў Беларусі і Расіі».

Прадстаўнікі маладзёжнага парламента і маладзёжных арганізацый з беларускага боку і «Расійскага саюза сельскай моладзі» абмяняліся ўражаннямі ад убачанага ў лясным лагеры барацьбітоў за мір і спакой, падзяліліся сваімі планамі ў рэчышчы патрыятычнага выхавання.

ТУТ БЯРОЗЫ ДЫ СОСНЫ — ПАРТЫЗАНСКІЯ СЁСТРЫ...

Тут усё, як спяваецца ў песнях пра беларускіх партызан: бярозы ды сосны над зямлянкамі, шумлівыя вершаліны над таямнічымі сцежкамі... Ёсць тут і жывы сведка тых часоў, калі лясныя гушчары надзейна хавалі сляды прыстанішча народных мсціўцаў, — магутны дуб, якому пад пяцьсот гадоў.

Стваральнікі гэтага комплексу імкнуліся аднавіць выгляд партызанскага лагера адпаведна з дакументальнымі крыніцамі, якія захоўваюцца ў Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У гады вайны такіх лясных баз на тэрыторыі Беларусі была вялікая колькасць, супраць акупантаў змагаліся амаль 380 тысяч партызан.

Рэканструктары аднавілі не толькі знешні выгляд зямлянак, але і далі магчымасць зазірнуць у кожную з іх — убачыць, як быў уладкаваны штаб, як жылі радавыя байцы, пазнаёміцца з інтэр'ерам лясной друкарні, разгледзець інструменты і зброю ў майстэрні.

Тут жа ўзведзены навес з шыльдай «Лясная школа». На гэтым месцы інструктар дзеліцца з экскурсантамі навыкамі выжывання ў лесе, нагадвае пра правілы беражлівых адносін да прыроды.

Супрацоўнікі ваенна-гістарычнага комплексу — людзі і дасведчаныя, і ініцыятыўныя. Адна з іх — выпускніца Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Кацярына РАМАНЮК *(на фота)*. Яна абараніла дыплом спецыяліста па турызме. Як і яе калегі, Кацярына сустракае наведвальнікаў у адзенні ваенных часоў.

Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.